**Літаратурна – музычны круіз**
**“Пад зоркай Максіма…”**



***Мэта:***

- пазнаёміць з некаторымі новымі для вучняў аспектамі творчасці Максіма Багдановіча;
- удасканальваць уменне выразна чытаць уголас мастацкія творы паэта;
- на прыкладзе асобы Максіма Багдановіча, на яго вершах выхоўваць у вучняў пачуццё прыгожага, любоў да радзімы;
- зацікавіць вучняў творчасцю песняра.

***Абсталяванне:*** партрэт паэта; плакаты з выказваннямі вядомых пісьменнікаў пра Багдановіча і яго творчасць: «Максім Багдановіч па праву заняў пачэснае месца ў нашай маладой паэзіі як высокаталенавіты паэт і майстра паэтычнай формы. Сярод беларускіх паэтаў Максім Багдановіч вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй, тонкім разуменнем і пачуццём паэзіі» Якуб Колас; «Ёсць паэты, якія пішуць творы, каб потым з іх выдаць выбранае, але ёсць і паэты, што пішуць толькі выбранае. Да такіх і належыць Максім Багдановіч» Максім Танк; кніжная выстаўка твораў Багдановіча і літаратурных прац аб ім; выстаўка вучнёўскіх ілюстрацый да вершаў паэта; на стале — букет валошак; мультымедыйны праектар, аўдыя запісы.

**Бібліятэкар:** Вялікі грамадзянін і патрыёт, ён усё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню народу... Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе гэтага слова, Максім Багдановіч ад самых пачаткаў сваёй творчасці быў у абсягу перадавых агульна чалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы...

Шчасце свайго народа ён бачыў у выхадзе яго на шырокую арэну агульначалавечай гісторыі», - так пісаў Кузьма Чорны пра Максіма Багдановіча.

У гэтым годзе мы святкуем 130 -годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча - паэта з рэдкім мастацкім дарам, самай яркай зоркі пасля Янкі Купалы і Якуба Коласа на небасхіле беларускай паэзіі.

*Дэманструюцца слайд з партрэтамі М. Багдановіча, гучыць спакойная мелодыя, на яе фоне чытальнік выконвае верш паэта «Мая душа».*

**Чытальнік:**

Мая душа, як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор,
Вартуе вольных птушак крыкі, –
Мая душа як ястраб дзікі.

Учуўшы іх, страхне вялікі
Свой сон, шыбне ды вышай гор, –

Мая душа як ястраб дзікі,
Што рвецца ў неба на прастор!

**Бібліятэкар:**Максім Адамовіч Багдановіч нарадзіўся ў Мінску 27 лістапада 1891годзе. Бацькі паэта былі інтэлегентнымі высакаадукаванымі людзьмі. Ранняе маленства прайшло у Гродне. У Гродне хлопчык спазнаў вялікае гора: смерць маці (у 5-гадовым узросце). Пасля смерці маці сям‘я пераехала ў Ніжні Ноўгарад.

Ад жыцця ў горадзе засталіся цікавыя і радасныя ўспаміны. Сустрэча Адама Багдановіча і Максіма Горкага не прайшлі бясследна для Максіма. З дзіцячых гадоў захаваў ён любоў да Горкага і яго творчасці.

Максім Багдановіч жыў у сям‘і, дзе шмат увагі аддавалася выхаванню дзяцей. Бацька абуджаў у дзяцей цікавасць да прыроды, знаеміў з жыццем народа, з помнікамі культуры, прывіваў любоў да літаратуры. Першымі кнігамі Максіма Багдановіча былі "Роднае слова" і "Дзіцячы свет".

У 1902 г. Максім Багдановіч паступіў у першы клас Ніжнегародскай мужчынскай гімназіі. Калі ен быў у 4 класе, у 1905 г., пачалася рэвалюцыя. Пачаліся хваляванні сярод моладзі, у якіх прымаў удзел Багдановіч, за што набыў рэпутацыю "нядобрага гімназіста".

У школьныя гады Багдановіч шмат чытаў. Вельмі любіў паэзію, музыку, народныя песні. З дзяцінства расла цікавасць да гісторыі беларускага народа, яго культуры. Ен самастойна вывучае беларускую мову, чытае кнігі па гісторыі Беларусі, пачынае пісаць па-беларуску.

Вершы стаў пісаць у 10 гадоў, але толькі ў 1907 г. на старонках "Нашай нівы" з‘явіўся яго першы твор — лірычнае апавяданне "Музыка", а потым і вершы. З гэтага пачалася яго літаратурная дзейнасць.

Максім Багдановіч пераязджае у Яраслаўль і ў 1908 г. паступае вучыцца ў Яраслаўскую гімназію. Пасля яе заканчэння ў 1911 г. вырашае наведаць Беларусь. Паездка ўзбагаціла яго новымі матэрыяламі, ведамі аб жыцціі культуры народа. Багдановіч марыў аб вучобе ў Пецярбургскім універсітэце, але слабае здароўе і матэрыяльная неабяспечанасць перашкаджалі.

У 1911 г. паэт паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Сярод ліцэістаў Максім вылучаўся начытанасцю, багатай эрудыцыяй. Усе сілы аддаваў літаратуры. Самастойна вывучаў замежныя мовы. Ліцэйскі перыяд быў плённым у паэтычнай дзейнасці. У гэты час ён напісаў лепшыя свае творы. У 1913 г. выйшаў яго адзіны зборнік вершаў "Вянок".

Летам 1916 г. скончыў ліцэй. Вырашае звязаць свой лёс з Бацькаўшчынай, пакідае Яраслаўль і едзе ў Мінск. Жыў у Змітрока Бядулі.

У 1917 г. здароўе пагоршылася, але паэт не здаваўся, не падаў духам, шмат пісаў. Але хвароба не адступала. Трэба было ехаць лячыцца. Сябры сабралі грошы і адправілі ў Крым. Шмат задум было ў Максма Багдановіча: рыхтаваў новы зборнік вершаў, працаваў над беларускім букваром. Але смерць не дала магчымасці ажыццявіць гэтыя жаданні. Памёр Максім Багдановіч 12 мая 1917 г. у Ялце. Пахаваны на Луцкіх гарацкіх могілках у Ялце.

***Дэманструецца слайд з выявамі бацькоў М.Багдановіча, будынка гімназіі, факсімільнае выданне газеты «Наша ніва», помнік паэту.***

**Настаўнік беларускаяй мовы і літаратуры:** Максім Багдановіч — мастак яркага лірычнага даравання. У яго вершах знайшлі выяўленне дэмакратычныя погляды і перакананні.

Паэт піша пра жыцце вёскі, пра яе долю-нядолю, стварае праўдзівы вобраз мужыка-пакутніка. Селянін у паказе паэта - чалавек бяспраўны, забіты і абяздолены, але ён пачынае разумець, на чыёй працы заснаваны дабрабыт грамадства і хто з‘яўляецца віноўнікам народных пакут (верш "Пан і мужык"). Багдановіч паказвае поўны трагізму шлях працоўнага чалавека ва ўмовах капіталізму, раскрывае класавыя супярэчнасці паміж працоўныміі эксплуатататарамі (верш "З песняу беларускага мужыка").

"Край мой родны! Як выкляты богам” - адзін з ранніх твораў грамадзянскай лірыкі Багдановіча. Гэты верш — паэтычны зварот да роднага краю, да народа з мэтай абудзіць яго свядомасць.

**Чытальнік:**

Краю мой родны! Як выкляты Богам —
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, балоты… Над збожжам убогім
Вецер гуляе на волі.
Поруч раскідаліс родные вёскі.
Жалем сціскаюцца грудзі! —
Бедные хаткі, тапол, бярозкі,
Ўсюды панурыя людзі…
Шмат што зрабілі іх чорныя рукі,
Вынеслі моцныя спіны;
Шмат іх прымусілі выцерпець мукі
Пушчы, разлогі, нізіны…
Кінь толькі вокам да гэтага люду –
Сціснецца сэрца ад болю:
Столькі пабачыш ты гора усюды,
Столькі нуды без патолі.
Песня пяе, як удовіна сына
Янку каханне згубіла;
Там, дзе панура схілілася каліна,
Беднага хлопца магіла.
Ў гутарках-казках аб шчасці, аб згодзе
Сэрца навін не пачуе.
Сціснула гора дыханне ў народзе,
Гора усюды пануе.
Хваляй шырокай разлілася, як мора,
Родны наш край затапіла …
Брацця! Цізможам грамадскае гора?
Брацця! Ці хваце нам сілы?

**Настаўнік беларускаяй мовы і літаратуры:** верш "Мяжы" (1914) - выдатны ўзор грамадзянскай лірыкі. Вобраз межаў - гэта сімвал прыгнечання, нявол. Межы падзялілі нівы, лугі, раз‘ядналі народ. Межы - прычына страшэннай сацыяльнай несправядлівасці. Верш - аўтарскі маналог, дзе апавядальная інтанацыя чаргуецца з заклікальнай.

**Чытальнік:**

Кінь вокам на увесь абшар зямлі:
Вось хату шчыльна абышлі
Парканы з гострымі цьвікамі,
Пасыпаныя бітым шклом,
Глядзі – ў прасторах за сялом
Мяжамі
Падзелены на нівах каласы,
Ідуць канаўкі праз лясы,
І стопудовыя гранічныя каменні
Сярод лугоў бяскрайных заляглі.
Шнуры штыкоў па ўсёй зямлі
Гараць, як дзікае хаценне,
На гасударстваў рубяжы.
Глядзі: паўсюль мяжы.
Нязьмерны вольныя прасторы
Святой зямлі, – а чалавек
Мяжы, ірвы, тыны рабіў за векам век,
Хаваўся ў іх, як ліс у норы,
І жыў пужліва сам – адзін,
Дрыжачы, як лісцё асін;
Зласлівы, бессардэчны, хцівы,
Такі здрадлівы,
Для ўсіх чужы, зусім чужы.
Вакол яго – платы, мяжы.
Пабач, што робіцца за гэтымі платамі!
Ў надмернай працы гіне тут
Галодны і абдзёрты люд,
Каторы моцнымі рукамі
Стварыў усе багатствы на зямлі:
Правёў ён скібы на раллі,
Ён рэйкі пралажыў чыгунак,
Заводаў коміны падняў у выш нябёс,
А сам даўно сляпы ад слёз
І ўжо забыўся аб ратунак.
Глядзі: па ўсёй зямлі святой
Шырокай хваляй залатой
Без краю блішча збожжа мора,
Цвітуць лугі, шумяць лясы...

Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь – мяжы, бо скрозь – платы.

**Бібліятэкар**: тэма любві да Бацькаўшчыны, ёй прысвечаны вершы пра гістарычнае мінулае Беларусі. Багдановіч напісаў цыкл вершаў "Старая Беларусь". Сюды ўвашлі вершы "Летапісец", "Кніга", "Слуцкія ткачыхі". Апошні верш найбольш выдатны, ён пакладзены на музыку. У ім праўдзіва раскрываюцца думкі і перажыванні прыгонных сялянак у феадальную эпоху. Паднявольная праца не прыносіць ім радасці. Чужыя персідскія ўзоры нялюбы іх сэрцу. Душа ткачых цягнецца на волю, да свайго роднага блізкага, дарагога. Ніякая прыгонная праца не можа адарваць народ ад свайго нацыянальнага, на чым грунтуецца яго дух, культура.

***Дэманструецца відыя выступлення ВІА "Песняры" з песняй "Слуцкія ткачыхі".***

**Бібліятэкар**: верш "Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі" сагрэты пачуццем гарачай веры паэта ў вызваленне народа. Магіла — сімвал смерці, жменя насення — вечнасць жыцця. Яна нагадвае паэту лёс беларускага народа.

**Чытальнік:**

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршку насення жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохшымі былі,
Ўсё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.
Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў, крыніца,
Каторая магутна, гучне мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

**Бібліятэкар**: любоўю да Радзімы прасякнуты многія вершы паэта. Сярод іх "Эмігранцкая песня" — твор, накіраваны супраць людзей, пазбаўленых пачуцця патрыятызму. Ім ен супрацьпастаўляе моцную прывязанасць простых людзей да роднай зямлі. Высокае пачуццё патрыятызму, адданасць Радзіме жыве ў народзе. Грамадзянскія матывы служэння радзіме, гатоўнасці змагацца за яе шчасце гучаць у вершах "Зразаюць галіны таполі адну за другой", "Пагоня".

**Чытальнік:**

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў па грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.
У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?
Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?
Бійце ў сэрцы іх — бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...
Маці родная, Маці-Краіна!
Не усьцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..
Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

**Настаўнік айчыннай і сусветнай мастацкай культуры:** Максіма Багдановіча называюць песняром красы і гармоніі. Яму уласціва пачуццё прыгожага. Пакой бацькавай кватэры заўсёды ўпрыгожвалі рэпрадукцыі з розных карцін, у свой час падараваны Максімам Горкім. Адной з іх з’яўляецца “Мадонна” Рафаэля. Да вобраза рафаэлеўскай “Мадонны” паэт звяртаўся часта ў сваіх вершах. Напрыклад, верш “У вёсцы”:

**Чытальнік:**
Калісьці летняю рабочаю парой
Праз вёску я ішоў. Панураю чаргой
З абох бакоў крывой і вузкай вулкі хаты
Стаялі — шэрыя, струхлеўшыя; як латы,
Віднеліся ў сцянах сляпыя вокны іх,
І аж счарнелася салома стрэх гнілых.
Ўсё руйнавалася, старэла, адмірала,
І мала што вакол хоць трохі аздабляла
Вясковую нуду: мак яркія цвяткі,
Рознакалёрныя, як тыя матылькі,
У градах высыпаў і цешыў імі душу,
Ды можна йшчэ было там-сам пабачыць грушу,
Крывую, старую… вось толькі і ўсяго.

І да таго ж з людзей не відна нікаго, —
Яны на полі ўсе; не мільканець спадніца,
Не пройдзе з вёдрамі па воду маладзіца,
Не ўгледзіш белую магерку мужыка,
Ў паветры не памкне іржанне жарабка,
і песня сумная не паліецца звонка…
Што ж дзіўнага, калі, раптоўна крык дзіцёнка
Пачуўшы, дрогнуў я і аглядзеўся. Ах!
Я спудзіў хлопчыка; на руках і нагах
Ён, бедненькі, папоўз па траўцы ля сьцяжынкі,
Да нянькі траплячы — так год васьмі дзяўчынкі.
І вось, дабраўшыся, ў падолак разам к ей
З трывожным голасам уткнуўся ён хутчэй
І, як схіляецца ад ветру верх бярозкі,
Дзяўчынка к хлопчыку нагнулася і, слёзкі
Сціраючы яму, штось пачала казаць,
Каб заспакоіць плач — зусім як быццам маць,
І саліваліся ў жывы абраз ядыны
Той выгляд мацеры ды з воблікам дзяўчыны,
Дзіцячым, цененькім; і ў гэты час яна,
Здавалася, была аж да краёў паўна
Якойсь шырокаю, радзімаю красою,
І, помню, я на міг пахарашэў душою.
А можа, не краса была ў дзяўчыны той, —
Дзяўчынцы ўпэцканай і хілай, і худой, —
А штось вышэйшае, што Рафаэль вялікі
Стараўся выявіць праз Маці Божай лікі.

**Бібліятэкар**: з грамадскай лірыкай цесна звязана лірыка кахання. Лепшыя вершы Багдановіча аб каханніі, дружбе могуць быць аднесены да шадэўраў сусветнай паэзіі. Сярод вершаў аб дружбе і каханні вылучаецца раманс "Зорка Венера”- гэта вельмі лірычны музыкальны твор. Ён кранае чытача сваёй задушэўнасцю, глыбінёй і шчырасцю пачуццяў юнака, які спазнаў шчасце кахання, а цяпер засмучаны тым, што растаецца з любай дзяўчынай. Усё гэта напаўняе душу героя і асацыіруецца з вобразам зоркі Венеры.

**Чытальнік:**

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.

Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе, – у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

**Бібліятэкар**: пра першае пачуццё кахання і верш «Ізноў пабачыў я сялібы...». Лірычны герой верша вяртаецца ў тыя мясціны, дзе прайшлі яго маладыя гады, дзе пазнаў ён першае каханне. Светлае пачуццё кахання стала асновай паэмы «Вераніка», у якой паэт стварыў вобраз каханай, поўны высокай красы і чароўнасці.

***Дэманструецца відыя выступлення ВІА “Песняры” з песняй «Вераніка» (сл. М. Багдановіча, муз. І. Лучанка).***

**Настаўнік беларускаяй мовы і літаратуры:** шмат вершаў паэт прысвяціў пейзажнай лірыцы. Ён любіў прыроду, умеў тонка і праўдзіва паказаць яе хараство. У вершы "Перад паводкай” паэт малюе вясенняе ажыўленне прыроды, якое сугучна з пачуццямі і перажываннямі паэта.
З вялікім майстэрствам напісаны верш "Па-над белым пухам вішань". У ім паэт тонка перадае музыку сінякрылага матылька, які спявае песню-гімн вясне. У вершы "Зімовая дарога” пейзаж зімовай дарогі гарманіруе з перажываннямі паэта, раскрывае яго вольналюбівыя імкненні.

Да пейзажнай лірыкі адносяцца вершы "Добрай ночы, зара-зараніца", "Зімою".

**Чытальнік:**
Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.
Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.
Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.
Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!

Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

**Настаўнік беларускаяй мовы і літаратуры:** Максім Багдановіч, прадаўжаючы і развіваючы традыцыі класічнай паэтыкі, адзін з першых у беларускай літаратуры пачаў распрацоўку такіх складаных вершаваных форм, як санет, трыялет, актава, тэрцына, рандо, пентаметр, рондэль і інш.

***На слайдах прыклад твораў «Я тайну ў глыбіні душы хаваю», «Мне доўгае расстанне з Вамі», «Як птушка ў гібкіх трасніках», «Ёсць чары ў забыўным, старадаўнім», «На могілках», пераклад верша П. Верлена «Рыцар Няшчасце».***

**Бібліятэкар**: кветкамі зямлі па праву можна назваць вершы Максіма Багдановіча. Ён быў песняром красы, паэтызаваў прыгожыя і неўвядальныя чалавечыя пачуцці.

Прапануем вам, шаноўныя, ускласці свой незвычайны букет у гонар памяці таленавітага паэта — гэта букет ведаў. Каб наш букет стаў вялікім і featured рознакаляровым, калі ласка, дабаўце ў яго свае краскі-адказы.

***У кожнага на сталах ляжаць кветкі-валошкі, зробленыя з каляровай паперы. Пры правільным адказе адна з кветак прымацоўваецца на дошцы ў вянок памяці Максіма Багдановіча.***

1. Раскажыце пра бацьку паэта. З якім вялікім рускім пісьменнікам ён сябраваў, а потым нават стаў сваяком?*(Вядомы беларускі этнограф, фалькларыст і лінгвіст. З М.Горкім).*

2. Назавіце першы твор Багдановіча. Калі і ў якой газеце быў надрукаваны ён?*(«Музыка». У газеце «Наша Ніва» ў 1907 г.).*

3. Багдановіч вядомы і як таленавіты перакладчык. З якіх моў ён перакладаў*?(З рускай, украінскай, французскай, іспанскай, нямецкай і інш.).*

4. Назавіце прозвішча беларускага пісьменніка, з якім Багдановіч сябраваў апошнія гады жыцця? Як назваў пісьменнік свае ўспаміны пра Багдановіча?*(Змітрок Бядуля; «Страцім-лебедзь».).*

5. У якіх гарадах жыў М.Багдановіч?*(У Мінску, Гродне, Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Ялце).*

6. Як называецца апошні верш паэта?*(«У краіне светлай, дзе я ўміраю...»).*

7. Як звалі дзяўчыну, з якой звёў лёс М. Багдановіча ў Яраслаўлі? *(Ганна Какуева.)*

8. . Прадоўжыце, калі ласка, паэтычныя радкі і скажыце, як называецца гэты верш: «Ад родных ніў, ад роднай хаты...». *(«...У панскі двор дзеля красы Яны, бяздольныя, узяты Ткаць залатыя паясы...»; «Слуцкія ткачыхі».)*

9. Хто сказаў пра М.Багдановіча: «Шчасце свайго народа ён бачыў у выхадзе яго на шырокую арэну агульначалавечай гісторыі. Як роўны з роўнымі, беларускі народ мысліўся ім сярод іншых народаў, і ў гэтым галоўныя матывы яго творчасці»?*(Кузьма Чорны).*

10. З якога верша гэтыя радкі: «...Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі Сінякрылы матылёк»? *(«Маёвая песня»; «Па-над белым пухам вішняў...».)*

11. Якую казку для дзяцей напісаў Багдановіч?*(«Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык»).*
12. Якую беларускую народную песню любіў паэт? *(“Не кувай ты, шэрая зязюля...”).*

**Бібліятэкар**: верш «Па-над белым пухам вішняў...» загучаў песняй. Паслухайце, калі ласка, яе.

Вось на гэтай светлай вясновай ноце мы і скончым літаратурна-музычны круіз, прысвечаны Максіму Багдановічу.

Хай яго паэтычнае слова не сыходзіць з нашых вуснаў.